3. Брендесов Р.Ф., Зверс Т.В., Качурин М.Г. Методика преподавания литературы. 2-е изд., дораб. М. : Просвещение, 1985.

4. Шамякін І. Трывожнае шчасце : аповесці. Мінск : Маст. літ., 2008.

# АДБІТАК ХАДЫ ЧАСУ: ВЫВУЧЭННЕ ТВОРЧАСЦІ ІВАНА ШАМЯКІНА Ў ШКОЛЕ

**А. В. Руцкая[1], М. У. Грынько[2]**

*[1] Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Сярэдняя школа №12 г. Гродна», вул. Паповіча, 32, 230024, Гродна, Беларусь,*

*[2] Навуковая бібліятэка Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы, вул. Ажэшкі, 22, 230023, Гродна, Беларусь, ngrynko@mail.ru*

Артыкул прысвечаны разгляду вывучэння творчасці класіка беларускай літаратуры Івана Шамякіна ў школе з 5 па 11 класы. Адзначана, што пра зацікаўленасць настаўнікаў у выкладанні творчасці Івана Шамякіна, узбагачэнне вопыту, у тым ліку чытацкага, як педагогаў, так і навучэнцаў сведчаць шматлікія публікацыі літаратуразнаўцаў, метадыстаў, настаўнікаў-практыкаў у галіновых перыядычных выданнях, у разнастайных зборніках навуковых прац, у якіх аўтары прапануюць разнастайныя шляхі, метады, прыёмы працы на ўроках беларускай літаратуры.

***Ключавыя словы***: Іван Шамякін; творчасць; урокі беларускай літаратуры.

Кожны гістарычны час мае сваё аблічча, усталёўвае свае прыярытэты, якія накладваюць адбітак на ўсё: на грамадскія працэсы, на жыццёвыя арыенціры чалавека, на

інтарэсы і запатрабаванні, на маральныя і эстэтычныя ідэалы. Асабліва значны ўплыў аказвае час на развіццё літаратурнага руху, а ў яго рэчышчы – на пісьменнікаў і іх творы, мастацкае асэнсаванне і адлюстраванне жыцця.

Адбітак хады часу выразна бачыцца і ў сферы канцэптуальных падыходаў да рэалізацыі літаратурнай адукацыі, інакш кажучы, непасрэдна ў тым, што прапануецца чытаць і вывучаць, бачыцца і ў спецыфіцы выбару метадычных шляхоў і спосабаў данесці мастацкае слова да вучняў, наладзіць іх дыялог з пісьменнікам.

Сёлетні год вылучаецца знакавымі юбілеямі, у іх ліку 100-годдзе выдатнага пісьменніка, класіка нашай літаратуры Івана Шамякіна, дыялог з якім доўжыцца ў школьных класах ужо сёмае дзесяцігоддзе, беручы выток з пяцідзясятых гадоў. У сваёй кнізе «Вывучэнне беларускай літаратуры ў школе» прафесар В. Я. Ляшук адзначыла, што школы Беларусі пасля вызвалення ў 1944 годзе ўзнаўлялі вучэбны працэс па даваенных праграмах. А ў 1955–1956 навучальным годзе ўсе школы рэспублікі перайшлі на новы вучэбны план, які прадугледжваў некаторае памяншэнне колькасці гадзін на гуманітарныя прадметы. Гэта было абумоўлена пераходам да політэхнічнага навучання. Што датычыцца школьных праграм па літаратуры, то яны мала змяніліся. В. Я. Ляшук піша, што падручнікі «папоўніліся новымі творамі, напісанымі галоўным чынам у час вайны і першае пасляваеннае дзесяцігоддзе» [ 2, с. 143]. Нельга не пагадзіцца з яе сумнай высновай, што недапушчальна марудна ўводзіліся ў праграмы старэйшых класаў новыя манаграфічныя тэмы: меней за дзесяць да сярэдзіны 60-х гадоў, «і гэта амаль што за паўстагоддзе, у цэлым плённае для беларускай літаратуры, калі многія нашы мастакі слова набылі сусветную вядомасць» [ 2, с. 143].

Творы Івана Пятровіча Шамякіна, які на той час ужо надрукаваў раман «Глыбокая плынь» (1949) і набыў шырокае прызнанне, у ліку першых былі ўключаны ў школьныя праграмы. Праўда, разам са значнай магчымасцю для тагачасных вучняў пазнаёміцца з творамі маладога празаіка, у якіх па-мастацку раскрываліся сэнсавыя глыбіні жыццёвых з’яў і чалавечых характараў,

меліся і свае адмоўныя ракурсы, бо хаця і тыражыравалася ў той час азначэнне, што «мастацкая літаратура для падрастаючага пакалення – гэта «акно ў жыццё» [3, с. 42], але тое акно было зацемнена моцнымі ідэалагічнымі ўстаноўкамі і патрабаваннямі як да аналізу і ацэнак зместу, так і да метадычных падыходаў. Так, у метадычным дапаможніку для настаўнікаў «Методыка літаратурнага чытання» (1956) І. С. Счаснага, што быў асноўным у сціплым (калі не лічыць ідэалагічныя нарматыўныя дакументы) вучэбна-метадычным комплексе па беларускай літаратуры, дэкляравалася, што мастацкія творы павінны «служыць мэтам камуністычнага выхавання», а «выкладчык літаратурнага чытання павінен заўсёды памятаць, што палітычнае выхаванне нельга адрываць ад набыцця літаратурных ведаў і навыкаў» [3, с. 48]. Зыходзячы з гэтых установак, адбіраліся творы для хрэстаматый. Уключаліся тэксты поўныя або скарочаныя, у якіх апускаліся другарадныя (з-за невыразнай ідэйнасці) часткі і эпізоды, а яшчэ ўводзіліся ўрыўкі вялікіх твораў, з іх браўся толькі адзін закончаны эпізод, па якім нельга было скласці ўяўлення аб сюжэце і героях усяго твора. Менавіта так сталася з адборам твораў Івана Шамякіна. Знаёмства з яго творамі пачыналася ў V класе. Літаратурны матэрыял у падручніку для пяцікласнікаў падзяляўся на чатыры раздзелы:

- вусная народная творчасць;
- пісьменнікі аб мінулым нашай Радзімы;
- аб жыцці дзяцей працоўных у капіталістычных краінах;
- савецкія пісьменнікі аб сацыялістычнай Радзіме.

Апошні раздзел у сваю чаргу падзяляўся на чатыры падраздзелы, адзін з якіх падаваўся пад назвай «Усенародная барацьба з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, пасляваеннае будаўніцтва і барацьба за мір».

У трэці раздзел было ўключана апавяданне Івана Шамякіна «Хлопчык з-за акіяна». Гэты твор, як і апавяданне Янкі Маўра «Слёзы Тубі», як нельга лепш адпавядалі ўзроставым асаблівасцям пяцікласнікаў. А таму лёсы цэйлонскага хлопчыка Тубі і негрыцянскага хлопчыка Нора з амерыканскіх прэрый асабліва моцна краналі

дзіцячыя пачуцці. Вучні са шчырай цікавасцю і даверам успрымалі ў той час мастацкія творы, бо гэта былі крыніцы, якія пашыралі іх свет. Дарэчнымі былі і метадычныя парады для настаўнікаў, калі не лічыць ідэалагізаваныя пытанні да твораў. Рэкамендавалася надаваць увагу выразнаму чытанню, маўленню. Канкрэтна да названых твораў была парада, ажыццяўляючы працу па мастацкіх тэкстах, выкарыстаць геаграфічную карту і зрабіць адпаведны каментар (першыя прыёмы інтэгравання ведаў), а таксама даць заданне правесці параўнанне вобразаў, што садзейнічала выпрацоўцы неабходных навыкаў параўнальнага аналізу.

У праграмы для V–VII класаў для пяцідзясятых гадоў па літаратуры былі ўключаны творы на партызанскую тэму. З рамана Шамякіна «Глыбокая плынь» быў уведзены ўрывак «Веснік радасці». Відавочна, стваральнікі праграм і падручніка выбралі эпізод тэматычна паказальны. У партызанскую брыгаду з Вялікай зямлі, з Масквы прыляцеў пасланец і прывёз радасную вестку аб дапамозе партызанам. Узмацняецца гэта радасць тым, што веснік яе прыбыў у брыгаду, дзе ваююць бацька, сястра і каханая. Пафасны зварот Карпа Маеўскага да сына вучнямі ўспрымаўся як звыклы і тыповы. Поўнае знаёмства з творам не прадугледжвалася, а таму навізна і арыгінальнасць жыццёвай і светапогляднай канцэпцыі, якая ўтрымліваецца ў аснове гэтага твора, заставалася нераскрытай. Зрэшты і крытыка ў цэлым не здолела адразу ацаніць раман аб’ектыўна. Метадысты ж абышліся простай парадай, што «да ўрыўка з вялікага твора няма патрэбы ў перадачы хоць бы кароткага зместу твора, даволі спыніць увагу толькі на змесце самога ўрыўка» [3, с. 88]. Каб усё ж запоўніць і разнастаіць зместавую прастору ўрока, раілася паказаць кнігу, партрэт пісьменніка і прадэманстраваць некалькі рэпрадукцый карцін: А. Д. Шыбнёва «Палонных вядуць», В. П. Сухаверхава «За родную Беларусь», Е. Н. Ціхановіча «У засадзе», «Дапамога Масквы партызанам».

Ад такога знаёмства з мастацкім тэкстам, дзе аўтарскае адлюстраванне падзеі падавалася вельмі ўмоўна,

у вучняў складвалася дастаткова цьмянае ўспрыняцце і аўтара, і твора.

Не пазбегнуў скарачэнняў і раман «Крыніцы», што тым не менш спадабаўся падлеткам аўтарскім уменнем захапіць перажываннямі герояў, цікава весці апавяданне і запомніўся вобразам вучня Алёшы Касцянка, які працаваў на камбайне ў час жніва. Гэты амаль паэтычны эпізод, прасякнуты юначым захапленнем радасцю працы, быў настолькі жыццёвы, што вобраз героя літаратурнага пераўтвараўся ў дзіцячым уяўленні ў вобраз рэальны. Варта адзначыць, што гэта быў спецыфічны час: методыка выкладання літаратуры ў школе была абумоўлена ўплывам ідэалогіі, залежнасцю ад эстэтыкі сацрэалізму, цвёрдымі ўстаноўкамі як тлумачыць той ці іншы твор, а ў літаратурнай творчасці вядучых пісьменнікаў ужо актыўна вызначаліся праявы іншага зместу, іншых прынцыпаў і падыходаў у паказе рэчаіснасці і чалавека. Творчыя настаўнікі ўмудраліся і ў тых умовах ажыццяўляць на ўроках адступленні ад трафарэтнасці, даючы вучням адысці ад установак падручніка і самастойна паразважаць, нават падыскутаваць, але пасля нацэльвалі, асабліва калі яшчэ здаваўся экзамен па літаратуры, каб матэрыял усё ж вывучылі па падручніку. Такая стратэгія даволі шырока пачала спрацоўваць ужо пры вывучэнні пенталогіі «Трывожнае шчасце» Івана Шамякіна. Магчымасць адчуць і зразумець, як жыла моладзь, на долю якой выпала Вялікая Айчынная вайна, прываблівала старшакласнікаў. Ім падабалася чытаць і разважаць пра прыгажосць і непаўторнасць першага кахання, іх хвалявалі радасці і пакуты, якія перажывалі Пятро Шапятовіч і Саша Траянава, ім імпанаваў шчыры аўтарскі аповед, адкрыты, сур’ёзны або афарбаваны цёплым і спагадлівым гумарам. Падлеткі зацікаўлена вялі размову з настаўнікам пра рэўнасць, пра прагматызм і халодны разлік, пра непераходныя каштоўнасці чалавечага жыцця. Гэтыя першыя крокі ў рэчышчы развіваючай парадыгмы, можна сказаць, першыя прыступкі да сучасных інавацыйных тэхналогій абуджалі ў вучняў цікавасць да асобы пісьменніка, да літаратуры.

У 90-я гады згодна з Законам аб адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь працэс вывучэння літаратуры ў школе адбываецца ў два этапы: V-IX (базавая школа) і X-XI (сярэдняя школа) класы. Для кожнага з этапаў быў характэрны свой змест літаратурнай адукацыі: ад вуснай народнай творчасці да сучаснага развіцця мастацкага слова. Такім чынам, вучні школьны курс літаратуры праходзілі за базавую школу на больш простым узроўні, а затым за сярэднюю – на больш глыбокім, што адпавядала ўліку узроставых асаблівасцей. Прынцып пераемнасці ажыццяўляўся не толькі ў лінейным, але і ў канцэнтрычным размеркаванні літаратурнага матэрыялу, калі да твораў аднаго і таго ж аўтара школьнікі мелі магчымасць звяртацца ў розных класах. У межах такога падыходу вучням прапаноўваліся тры творы Івана Шамякіна – «Гандлярка і паэт» і «Непаўторная вясна» або «Сэрца на далоні» (на выбар).

Адразу зазначым, што аповесць «Гандлярка і паэт» вымагала з боку настаўнікаў метадычнай прадуманасці шляхоў яе аналізу, каб вучні не проста праявілі цікавасць да захапляльнага сюжэту, не проста канстатавалі, што гераіня змянілася, а зразумелі вытокі яе духоўнага росту. Каб, пільна ўглядаючыся ў вобраз Вольгі, вучні абдумана прыходзілі да высновы, што яе ўнутраны свет не замкнёны, а рухомы, здольны пазбавіцца карыслівага, эгаістычна жорсткага. І гэта дапамагала падлеткам зразумець гуманістычную місію пісьменніка, зразумець, што, зноў звярнуўшыся да падзей Вялікай Айчыннай вайны, Шамякін выяўляе новы падзейны ракурс, новы падыход да асэнсавання ўнутранага свету чалавека. Бо для пісьменніка, як зазначае Алесь Бельскі ў сваёй кнізе «Класікі і сучаснікі ў школе», «галоўнае – намаляваць такі вобраз-персанаж, за якім яскрава праглядваліся б чалавечы характар і само жыццё» [1, с 158].

У новых вучэбных праграмах па літаратуры (2017) для XI класа прапануецца для вывучэння раман «Сэрца на далоні». Да гэтага твора не страцілася цікавасць ад далёкага 1963 года, калі яго ўзялі ў рукі першыя чытачы. Ён актуальны дынамічным і захапляльным сюжэтам і тым, што звернуты да самых надзённых і важных праблем

жыцця. Гэта сувязь праўды мінулага і праўды сучаснасці, адносіны паміж пакаленнямі, праблемы моладзі, праблемы грамадства і асобы, гэта адвечныя канфлікты паміж дабром і злом, паміж людскасцю і нялюдскасцю, якія праз увесь пісьменніцкі шлях хвалявалі выдатнага творцу, і заахвочваюць да роздуму сучасных вучняў.

Пра зацікаўленасць настаўнікаў у выкладанні творчасці Івана Шамякіна, узбагачэнне вопыту, у тым ліку чытацкага, як педагогаў, так і навучэнцаў сведчаць шматлікія публікацыі літаратуразнаўцаў, метадыстаў, настаўнікаў-практыкаў у галіновых перыядычных выданнях, у разнастайных зборніках навуковых прац. Так, напрыклад, у часопісах «Роднае слова» і «Беларуская мова і літаратура» рэгулярна з'яўляюцца матэрыялы, прысвечаныя вывучэнню жыцця і творчасці класіка. Таксама зазначым, што ў серыі «З вопыту работы», напрыклад, у дапаможніку Н. І. Валынец «Планы-канспекты ўрокаў па беларускай літаратуры для 11 класа» [4] прапануецца распрацоўка ўрокаў па вывучэнні манаграфічнай тэмы «Іван Шамякін», дзе аўтар прапануе разнастайныя шляхі, метады, прыёмы працы на ўроках беларускай літаратуры.

Усё вышэй адзначанае дазваляе зрабіць выснову, што імя народнага пісьменніка Беларусі Івана Шамякіна даўно і трывала ўпісана ў гісторыю нацыянальнай літаратуры і культуры, а яго творы ўваходзяць у залаты фонд літаратурнай класікі Беларусі.

**Бібліяграфічныя спасылкі**


1. Бельскі А. І. Вывучэнне творчасці пісьменнікаў: класікі і сучаснікі ў школе. Мінск: Аверсэв, 2005.

2. Ляшук В. Я. Вывучэнне беларускай літаратуры ў школе: Гісторыка-метадычны нарыс. Мінск: Універсітэцкае, 1994.

3. Счасны І. С. Методыка літаратурнага чытання. Мінск: Дзяржвыд. БССР, 1956.

4. Валынец Н. І. Планы-канспекты ўрокаў па беларускай літаратуры. 11 клас (І паўгоддзе): дапаможнік для настаўнікаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі. Мазыр: Белы Вецер, 2013.

## ШАМЯКИН LIVE: ПОПУЛЯРИЗАЦИЯ ЛИТЕРАТУРНОГО НАСЛЕДИЯ ИВАНА ШАМЯКИНА ПОСРЕДСТВОМ ИНТЕРАКТИВНЫХ ПРАКТИК

**С. В. Равинская**

*Библиотека-филиал № 2 им. И. Шамякина г. Могилёва,*
*ул. Якубовского, 23, 212012, Могилёв, Беларусь, mgbf2@mail.ru*

В статье рассказывается о проведенных в библиотеке-филиале №2 им. И. Шамякина г. Могилева мероприятиях, приуроченных к столетнему юбилею класика белорусской литературы Ивана Шамякина. Подчеркивается новаторский подход в организации всех акций, их многообразие и интерактивный характер, направленный на популяризацию творческого наследия писателя.

***Ключевые слова***: Иван Шамякин; наследие Ивана Шамякина; популяризация; интерактивные практики.

30 января 2021 года общественность Беларуси отметила 100-летие со дня рождения писателя, сценариста, общественного деятеля Ивана Петровича Шамякина, чьё литературное наследие является не только частью стран постсоветского пространства, но и культурным достоянием многих стран Европы.

Библиотека-филиал № 2 им. И. Шамякина г. Могилева – единственная в Республике Беларусь библиотека, носящая имя писателя, поэтому юбилейные мероприятия в библиотеке, приуроченные к данному событию, стали знаковым событием в жизни не только ее